Бачэйкаве і абласным свяце "Гліняны звон" у Любані. У 1998 г. на базе Цэнтра рамёстваў было праведзена другое абласное свята ганчароў "Гліняны звон".

Зараз пры Цэнтры рамёстваў дзейнічаюць майстэрні keramiki і ткацтва, на грамадскіх пачатках працуе школа рамёстваў. Тут захоўваюцца, вывучаюцца і развіваюцца традыцыі народнага мастацтва, адраджаюцца забытыя рытуалы і абрады рамеснікаў. Навучальны працэс набліжаны да натуральнага цэхавага спасціжэння асноў рамяства праз класічны трохвугольнік: вучань-чаляднік-майстар. Традыцыйнымі становяцца конкурсы майстроў, прысвечаныя слынным мясцовым майстрам, якія пакінулі яркі след у рэчышчы развіцця івянецкай школы народнага мастацтва, святы рамёстваў. Дзейнічае Івянецкае рэгіянальнае аддзяленне Беларускага саюза майстроў народнай творчасці.

Музей набывае рысы асяродка культуры, які сінтэзуе культуралагічную, тэарэтычную, выставачную і фондавую работу з практычнай дзейнасцю ў майстэрнях-лабараторыях Цэнтра рамёстваў праз навучальна-выхаваўчую функцыю на аснове народнай педагогікі і дасягненняў сучаснай педагагічнай думкі.

У аснову метадалогіі адраджэння і развіцця народных традыцый закладзена стрыжнёвая ідэя — да новага праз добра забытае старое. Рэтраспекцыя ў кантэксце адраджэння і развіцця традыцый івянецкай школы народнага мастацтва становіцца актуальнай і першаснай на дадзеным этапе.

К.А.Цітоў,
*студэнт*

## РЫНКА ЯК ВІД ТРАДЫЦЫЙНАГА ПОСУДУ БЕЛАРУСАЎ

Беларусь багатая глінай — асноўнай сыравінай для ганчарнай вытворчасці. Гэта і абумовіла ўзнікненне ганчарства на яе тэрыторыі з даўніх часоў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Самыя старажытныя ўзоры керамкі адносяцца да эпохі неаліту, яны ўяўляюць даволі груба вылеплены посуд, які абпальваўся ў вогнішчы.

У X—XII стст. на этнічных тэрыторыях Беларусі пачалі з'яўляцца гарады, сталі пашырацца гандлёвыя сувязі, развівацца рамёствы. Шырокае распаўсюджванне атрымала ганчарная вытворчасць. Тыповымі вырабамі былі гаршчкі, міскі, латушкі і іншае хатняе начынне. Гэты асартымент захаваўся амаль без змен да нашага часу. Глякі, збаны і рынкі з'явіліся пазней. Магчыма, таму яны даволі рэдка сустракаюцца ў матэрыялах раскопак, якія адносяцца да гэтага перыяду.

У ганчарнай вытворчасці сучаснай Беларусі не адбылося прынцыповых змен як у тэхналогіі, так і ў форме керамічных вырабаў, іх арнаментоўцы. Яны вызначаюцца прастатой, выразнасцю формаў, гарманічным спалучэннем з дэкорам.

Паводле функцыянальнага прызначэння беларуская кераміка падзяляецца на групы: кухонны посуд (для гатавання ежы); посуд для захоўвання і транспарціроўкі прадуктаў; сталовы посуд; сасуды для піцця; гігіенічны посуд; дэкаратыўная кераміка (па аздабленні інтэр'ераў); архітэктурна-будаўнічая кераміка; вырабы рознага гаспадарчага ўжытку; цацкі (сувенірная кераміка).

Упершыню ў Беларусі рынка зафіксавана ў канцы XV ст.

Рынка — пасудзіна на трох ножках з ручкай-вухам або ўтулкай для драўлянай ручкі. На поўначы, паўночным захадзе і ўсходзе, а часткова ў цэнтральнай частцы Беларусі замест рынак сяляне выкарыстоўвалі накрыўкі ад гаршкоў. Рынкі мелі пляскатую паверхню, мелкія, злёгку адагнутыя сценкі. Яны нагадвалі патэльню і былі зручнымі для смажання ў печы.

Найбольшае распаўсюджванне рынкі атрымалі ў XVI—XVII стст. Асноўная частка рынак, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, прыблізна мае ад 3 да 5,5 см у глыбіню пры дыяметры вянца ад 16 да 21 см. Дзяржальныя полыя ўтулкі ў начыннях XVI—XVII стст. маюць на канцы адзін ці два рабрыстыя валікі. Формы і памеры ножак — ад 4,5



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

да 5 см. Злёгку завостраныя, гарызантальна зрэзаныя ўнізе ножкі сустракаюцца значна раней і не перавышаюць 6,5 см. Форма тулава найчасцей піялападобная з патоўшчаным скругленым вянком.

Сустракаюцца і глыбокія рынкі (да 12 см), што нагадваюць макітры на ножках. Яны маюць адну (ці дзве) ручку-вуха і прыблізна 10-сантыметровыя ножкі. Начынне такога кшталту знойдзена ў вялікай колькасці падчас археалагічных раскопак у Міры, Гальшанах і Мсціславе.

Абедзве разнавіднасці рынак мелі накрыўкі. Рынка вельмі трывала стаяла на трох ножках сярод вугалля, калі ў ёй гатавалі ежу. Знутры яна была пакрыта шклопадобнай зялёнай або рудой палівай. Дзякуючы гэтаму посуд добра і чыста мыўся.

У познім сярэднявеччы ў Заходняй Еўропе, а таксама ў Прыбалтыцы і Польшчы побач з рынкамі шырока ўжываліся шматлікія разнавіднасці посуду на трох ножках. Вядомы лінгвіст А.М.Трубачоў прааналізаваў назвы начыння на ножках у мовах чэхаў, харватаў, славакаў і вызначыў, што ўсе яны паходзяць ад верхненямецкага *raidel, rindel* (трохногі гліняны гаршчок, ці тыгель), якія ў сваю чаргу паходзяць ад старажытнанямецкага *rain, rina*. Ад апошняй асновы ўтварыліся польскія *rynka, rynezka,* а таксама чэшская, славацкая і іншыя назвы па меры распаўсюджвання гэтага віду посуду на той або іншай тэрыторыі. Зробленыя высновы не супярэчаць археалагічным звесткам.

Найбольш раннія знаходкі посуду на ножках зафіксаваны на тэрыторыі Германіі. Там знойдзены непаліваны гаршчок на чатырох ножках, які датуецца XIV ст. Самыя першыя з вядомых у Беларусі рынак былі таксама непаліваныя. Пра гэта сведчаць знаходкі некалькіх фрагментаў з Лідскага замка, з Мсціслава, датаваныя XV ст. Як і гаршкі гэтага часу, яны зроблены на ручным коле, мелі ляпную ручку амаль цыліндрычнай формы. Крыху пазней увесь посуд выраблялі на нажным коле з аднаго кавалка гліны. Потым да крыху падвяленага вырабу прыляпляліся ножкі і дзяржак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Формы і арнаментацыі беларускага посуду паказваюць, што мясцовыя ганчары не слепа пераняли форму еўрапейскай рынкі, а ўспрынялі саму ідэю ўжывання посуду на ножках. З пункту гледжання утылітарнага прызначэння, рынка — ідэальная форма для прыгатавання ежы для тагачаснага жыхара. Яна вельмі ўстойлівая і зручная ва ўжытку і адпавядала канструкцыі тагачасных печаў, што не мелі фаерак.

Ужыванне рынак сведчыць аб тым, што беларускае ганчарства развівалася ў рэчышчы агульнай еўрапейскай культуры.

Першыя рынкі, якія з'явіліся ў Беларусі ў канцы XV ст., паступова ўвайшлі ў быт мясцовых жыхароў. Тутэйшыя майстры ўдасканалілі і надалі ім традыцыйныя беларускія рысы. Рынкі карысталіся вялікай папулярнасцю, аб гэтым сведчыць і тое, што на захадзе Беларусі рынкі выраблялiся аж да пачатку XX ст. У канцы XIX — пачатку XX ст. іх вытворчасць была наладжана ў Пружанах і Гародні.

Паступовае скарачэнне вытворчасці, а потым і знікненне рынак былі заканамернымі з'явамі. Нават канструкцыі печаў больш адпавядала круглая патэльня без ножак, з плоскім донцам.

У XX ст. пачынаецца заняпад традыцыйнай керамікі. Буйнымі тэмпамі пачала развівацца прамысловасць, што і абумовіла заняпад дэкаратыўнага мастацтва. Але традыцыйнае беларускае мастацтва зусім не знікла, яно дзе-нідзе існавала, захоўваючы назапашаны вопыт папярэдніх пакаленняў.

У 90-х гадах XX ст. пачалося адраджэнне культурнай спадчыны Беларусі. З кожным годам колькасць майстроў-керамістаў павялічваецца. Яны ўкараняюць новы мастацкі напрамак, імкнуцца рабіць патрэбныя, прыгожыя рэчы, якія радавалі б людзей, задавальнялі іх эстэтычныя патрэбнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ